Аб'ектам гэтага права ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца зямельны ўчастак, дадзены для мэт, замацаваных у заканадаўстве. Кодэкс аб зямлі замацоўвае 2 віды З.: пажыццёвае спадчыннае валоданне зямлёй грамадзян Рэспублікі Беларусь і пастаяннае валоданне калгасаў, саўгасаў, інш. дзярж., каап., грамадскіх прадпрыемстваў, устаноў і арг-цый, рэліг. арг-цый. Зямельныя ўгоддзі даюцца грамадзянам у пажыццёвае спадчыннае валоданне з мэтай вядзення сялянскай гаспадаркі, буд-ва і абслугоўвання жылога дома, дачнага буд-ва, садаводства, жывёлагадоўлі і традыц. нар. промыслаў. У законе ўстаноўлены найб. нарматывы плошчы зямельных участкаў для кожнай мэты (напр., для вядзення сял. гаспадаркі — да 50 га с.-г. угоддзяў). У пастаяннае валоданне зямля даецца для 2 мэт — для вядзення сельскай і лясной гаспадаркі. Ва ўсіх астатніх выпадках юрыд. асобам зямля даецца ў карыстанне або арэнду. Кожны землеўладальнік можа быць адначасова і землекарыстальнікам, але не наадварот. У адрозненне ад прыватнага ўласніка землеўладальнік пазбаўлены права распараджацца зямельным участкам. Паводле закону землеўладальнік мае права самастойна гаспадарыць на зямлі, мае права ўласнасці не толькі на пасевы і выраблёную с.-г. прадукцыю, але і на даходы ад яе рэалізацыі і, у выпадку адабрання зямлі або добраахвотнага адмаўлення ад зямельнага ўчастка, мае права атрымаць поўную кампенсацыю затрат на павышэнне ўрадлівасці глебы. У астатнім іх правы ідэнтычныя правам і абавязкам землекарыстальнікаў (гл. *Землекарыстанне*). Падставы ўзнікнення, пераходу і спынення права З. таксама адзіныя.

У феад. перыяд на Беларусі было шырока распаўсюджана ўладанне няўласнымі землямі (пасесія), формамі яго былі падараванне, арэнда, заклад (застава), пажыццёвае кіраванне (трыманне). У пасесійным уладанні, пераважна ў форме падаравання буйным феадалам, часта знаходзіліся дзярж. землі. У заклад і арэнду паступалі ў асноўным прыватнаўласніцкія землі — ва ўладанне магнатаў і найб. прадпрымальніцкай ч. буйной і сярэдняй шляхты. У ролі трымальніка зямель выступала і царква. У 16 ст. ў ВКЛ прыватнае З. складала каля 65%, дзяржаўнае — 30, царкоўнае — 5%. У выніку пераразмеркавання ўладання зямлёй на Беларусі ў апошняй чвэрці 18 ст. на прыватнае З. прыпадала 79,8% зямельнай плошчы, дзяржавы — 7,6, царквы — 12,6%. Памешчыкі часта закладвалі зямлю ў крэдытных установах. Пасля рэформы 1861 уладальнікамі зямельных надзелаў сталі і сяляне, вызваленыя ад прыгоннай залежнасці і пераведзеныя на выкуп. Купля-продаж і дарэнне зямлі былі моцна абмежаваны. Сялянам забаранялася закладваць надзельныя землі нават пасля выкупу. Яны былі абмежаваны і ў правах распрацоўкі нетраў на надзельнай зямлі. Абмяжоўвалася права сялян на надзельную зямлю, замацаваную ў асабістую ўласнасць у выніку *Сталыпінскай аграрнай рэформы* (продаж гэтай зямлі толькі сялянам, заклад яе толькі ў Сялянскім пазямельным банку). Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 уласнікам зямлі з'яўлялася Сав. дзяржава, якая валодала і правам З. Грамадзяне і арг-цыі маглі валодаць зямлёй толькі ў выпадках, калі яе давалі ў карыстанне сав. органы. У сувязі з нацыяналізацыяй зямлі ў СССР у зямельных адносінах былі выключаны купля-продаж зямлі. Зямля не магла быць аб'ектам таварнага абароту, пазыкі, арэнды, дарэння і завяшчання; забараняўся абмен зямлі без ведама і дазволу дзяржавы.

*Літ.*: Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861—1900 гг. Мн., 1990.

*В.М.Заркоў, В.П.Панюціч.*

**ЗЕМЛЕЎПАРА́ДКАВАННЕ**, сістэма мерапрыемстваў па арганізацыі выкарыстання зямлі як сродку вытворчасці і рэгулявання грамадскіх адносін, звязаных з уладаннем і карыстаннем зямлёю. У Рэспубліцы Беларусь З. заснавана на дзярж. і прыватнай уласнасці на зямлю і накіравана на ажыццяўленне зямельнага заканадаўства, арганізацыю *землекарыстання*, ахову зямель. У сістэму З. ўваходзяць: распрацоўка прагнозаў, рэсп. і рэгіянальных праграм выкарыстання і аховы зямельных рэсурсаў; устанаўленне на мясцовасці межаў адм.-тэр. адзінак; адвод зямельных участкаў, выяўленне новых зямель для с.-г. і інш. асваення; правядзенне тапографа-геадэзічных, картаграфічных, глебавых, геабатанічных і інш. абследаванняў і пошукаў; фарміраванне спец. фонду зямельнага запасу мясц. Саветаў і інш. У адпаведнасці з зямельным заканадаўствам прадастаўленне зямельных участкаў у валоданне, карыстанне і ўласнасць грамадзянам Рэспублікі Беларусь, калгасам, саўгасам і інш. дзярж., каап., грамадскім прадпрыемствам, установам і арг-цыям, а таксама іх канфіскацыя адносяцца да кампетэнцыі мясц. Саветаў. Рэсп. органам дзярж. кіравання ў галіне З. з'яўляецца Камітэт па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванні пры СМ Рэспублікі Беларусь. Дзеючым заканадаўствам прадугледжана выдача спец. дазволаў (ліцэнзій) розным суб'ектам гаспадарання (незалежна ад форм уласнасці) на ажыццяўленне асобных відаў дзейнасці ў галіне З.

*С.У.Скаруліс.*

**ЗЕМЛЕЧАРПА́ЛЬНЫ СНАРА́Д**, плывучая землярыйная машына з чарпаковым прыстасаваннем для вымання грунту з-пад вады. Рабочы орган адначарпаковых З.с. — коўш ёмістасцю да 20 м$^3$ (глыбіня чарпання да 30 м) або *грэйфер*; многачарпаковых — шэраг каўшоў ёмістасцю да 1,5 м$^3$, злучаных у выглядзе замкнёнага ланцуга (глыбіня чарпання да 18 м). Падняты каўшамі грунт выдаляецца ў адвалы (разам з вадой па латаках, трубаправодах) ці загружаецца на грунтаадвозную шаланду або баржу. Выкарыстоўваюцца для днопаглыбляльных работ, капання падводных катлаванаў, узвядзення дамбаў, насыпаў, здабычы карысных выкапняў і інш. Здабыўныя З.с. маюць абагачальную ўстаноўку і наз. *драгамі*.

*М.М.Кунцэвіч.*

**ЗЕМЛЯЗНА́ЎСТВА**, раздзел *фізічнай геаграфіі*, які вывучае агульныя фізікагеагр. заканамернасці і галоўныя ўласцівасці *геаграфічнай абалонкі* Зямлі. Даследуе яе прасторава-часавую арганізацыю, дыферэнцыяцыю, кругаварот рэчываў і энергіі, дынаміку і эвалюцыю, ролю чалавецтва ў трансфармацыі геагр. абалонкі. З'яўляецца прыроднагіст. тэарэт. асновай аховы навакольнага асяроддзя, глабальнага мадэліравання; цесна звязана з *краіназнаўствам*. У З. шырока выкарыстоўваюцца геафіз., геахім., геал. і картаграфічныя метады. Тэрмін уведзены ням. географам К. Рытэрам (1-я пал. 19 ст.). Асновы сучаснага З. закладзены ў працах А.А.Грыгор'ева, С.В.Калесніка, В.А.Дзяменцьева і інш. Тэрмін выкарыстоўваецца таксама для абазначэння сукупнасці навук, аб'ектам якіх з'яўляецца Зямля як планета (гл. *Касмічнае землязнаўства*).

*Літ.*: Калесник С.В. Общие географические закономерности Земли. М., 1970; Мильков Ф.Н. Общее землеведение. М., 1990.

*В.П.Якушка.*

**ЗЕМЛЯМЕ́РЫ**, сям. матылькоў, гл. *Пядзенікі*.

**ЗЕМЛЯНА́Я ГРУ́ША**, кветкавая расліна, тое, што *тапінамбур*.

**ЗЕМЛЯНО́Е ПАЛАТНО́**, грунтавая аснова *аўтамабільных дарог* і чыг. пуцей у выглядзе насыпу, выемкі, паўнасыпупаўвыемкі або спрафіляванай на мясцовасці паласы ў нулявых адзнаках. На



Шматкаўшовы **землечарпальны снарад**.

пўтамаб. З.п. ўкладваецца *дарожнае адзенне*, на чыг. — верхняя будова пуці. Дл З.п. адносяцца кюветы, канавы, рэзервы, дрэнажныя і інш. непасрэдна звязаныя з палатном водаадводныя збудаванні. Выкарыстоўваецца для ўстаноўкі пуцявых і дарожных знакаў, агароджы, водапрапускных труб, падтрымных або ахоўных прыстасаванняў і канструкцый і інш. З.п. ўмацоўваюць дзёрнам, бетоннымі плітамі, поліэтыленавымі плёнкамі, вяжучымі матэрыяламі, пасевам траў. *І.І.Леановіч.*

**ЗЕМЛЯНЫ́ АРЭ́Х**, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Арахіс.*

**ЗЕМЛЯНЫ́ ЗАЯ́Ц**, т у ш к а н ч ы к в я л і к і (Allactaga major), млекакормячые сям. тушканчыкавых атр. грызуноў. Пашыраны ў Паўд.-Усх. Еўропе, Казахстане, Паўд. Сібіры. Жыве ў паўпустынях, лесастэпах, уздоўж дарог у норах.

Самы вял. тушканчык, даўж. цела 19—26 см, хваста да 30 см. Пыска выцягнутая, спераду пляскатая, вушы доўгія, заднія канеч-




**Земляное палатно** чыгункі: 1 — кавальер; 2 — кювет; 3 — паласа адводу; 4 — выемка; 5 — нагорная канава; 6 — забанкетная канава; 7 — банкет; 8 — насып; 9 — рэзерв.

насці пяціпальцыя, доўгія. На канцы хваста яркі і шырокі «сцяг» з чорнай асновай і белай верхушкай. Верх цела буравата-шэры або пясчана-шэры, знізу белы. Нараджае 1—4 дзіцянят. Корміцца насеннем, цыбулінамі і клубнямі розных раслін, зрэдку насякомымі. На зіму ўпадае ў спячку.



**Земляны заяц.**

**ЗЕМЛЯНЫ́ МІНДА́ЛЬ**, кветкавая расліна, тое, што *чуфа.*

**ЗЕМЛЯНЫ́Я АРЭ́ШКІ**, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Вятроўнік.*

**ЗЕМЛЯНЫ́Я БЛО́ХІ**, гл. *Блошкі.*

**ЗЕМЛЯНЫ́Я РАБО́ТЫ**, работы, звязаныя з распрацоўкай (вyманнем), перамяшчэннем і ўкладкай грунту ў пэўнае месца; від *будаўнічых работ.* Выконваюцца пры буд-ве плацін, дамбаў, дарог, пракладцы інж. сетак, плаціроўцы тэрыторый, раскрыцці радовішчаў і інш. Бываюць адкрытыя (на паверхні зямлі), падземныя і падводныя.

З.р. выконваюцца мех., гідрамех. (гл. *Гідрамеханізацыя*), выбуховым і камбінаваным спосабамі. Пры мех. спосабе капанне і перамяшчэнне грунту робяцца землярыйнымі і землярыйна-трансп. машынамі (*экскаватарамі, бульдозерамі, скрэперамі, грэйдэрамі, грэйдэрамі-элеватарамі, каналакапальнікамі, аўтапаяздамі, самазваламі* і інш.); разраўноўванне і ўшчыльненне — *пляніроўшчыкамі, каткамі дарожнымі, трамбавальнымі машынамі* і інш. Выбуховы спосаб эфектыўны пры распрацоўцы скальных, мёрзлых і інш. грунтоў павышанай трываласці. Метадам накіраванага выбуху часта забяспечваюць пасадку дарожнага насыпу на мінер. дно балота. Земляныя збудаванні, якія ствараюцца ў выніку З.р., бываюць у выглядзе выемак або насыпаў. Выемка, якая выкопваецца для здабычы грунту, наз. *кар'ерам* (часам рэзервам); насып, што ўтвараецца пры адсыпцы залішняга грунту, — *адвалам.* Да З.р. адносяць таксама падрыхтоўчыя і дапаможныя работы.

*Літ.:* Основы строительного дела. Мн., 1980. *І.І.Леановіч.*

**ЗЕМЛЯНЫ́Я ЧЭ́РВІ**, гл. *Дажджавыя чэрві.*

**ЗЕМЛЯРО́БСТВА**, 1) адна з асноўных галін *сельскай гаспадаркі*; вырошчванне культурных раслін для забеспячэння насельніцтва харч. прадуктамі, жывёлагадоўлі — кармамі, лёгкай і харч. прам-сці — сыравінай. Уключае паляводства (збожжавая гаспадарка, *ільнаводства, буракаводства, бульбаводства, насенняводства*, вырошчванне кармавых культур), *агародніцтва, пладаводства, кветкаводства.*

У 20 ст. распрацаваны і выкарыстоўваюцца навукова абгрунтаваныя сістэмы З., якія ўключаюць развітую агратэхніку, палепшаную апрацоўку глебы, удасканаленае насенняводства, навук. селекцыю высокаўраджайных сартоў с.-г. культур, у адпаведнасці з канкрэтнымі ўмовамі прыродна-эканам. раёнаў уводзяцца севазвароты, ажыццяўляецца меліярацыя, на аснове хімізацыі шырока ўжываюцца мінер. ўгнаенні, развіваецца эфектыўная сістэма аховы раслін. Існуе э к с т э н с і ў н а е З. (рост вытв-сці за кошт расшырэння плошчаў) і і н т э н с і ў н а е (рост вытв-сці за кошт дадатковых укладанняў працы і сродкаў). Вылучаюць: а р а ш а л ь н а е З. (са штучным арашэннем), б а г а р н а е (у раёнах арашальнага З., але магчымае без паліву); с у х а д о л ь н а е або сухое (з дэфіцытам атм. ўвільгатнення і няўстойлівасцю прыродных умоў); у с т о й л і в а е (у абласцях дастатковага ўвільгатнення); к р у г л а г а д о в а е (у вільготных субтропіках і тропіках, з вырошчваннем 2—3 ураджаяў за год), а таксама г о р н а е (пераважна на схілавых тэрасах), п а л я р н а е (з выкарыстаннем парнікоў) і інш. Аснова З. — паляводства, а яго гал. галіна — збожжавая гаспадарка. У 1994 сусв. вытв-сць збожжа склала 1940,1 млн. т, яго вядучыя вытворцы — Кітай (больш за 20 % сусв. збору збожжа), ЗША (17%), Індыя (11%). Са збожжавых культур найважнейшае значэнне маюць пшаніца, рыс і кукуруза. У 1994 у свеце было сабрана 534,3 млн. т пшаніцы; вядучыя вытворцы — Кітай (19 % сусв. вытв-сці), ЗША (12%), Індыя (11%). Прыкладна столькі ж збіраюць рысу — 531,3 млн. т (1994). Асн. рысасеючыя краіны — Кітай (больш за 30% сусв. збору) і Індыя (больш за 20%). Кукуруза — гал. зернефуражная культура. У 1994 яе вытв-сць склала 551,2 млн. т. Гал. вытворцы — ЗША (42%) і Кітай (19%). Тэхн. культуры забяспечваюць сыравінай розныя галіны прам-сці. Найб. значэнне маюць алейныя (сланечнік, соя, рапс і інш.), цукраносныя (цукр. буракі, цукр. трыснёг), валакністыя (бавоўна, лён-даўгунец, каноплі, джут і інш.). Бульбаводства — галіна З. па вырошчванні бульбы на харч., тэхн. і кармавыя мэты. Яго сусв. вытв-сць склала 283,3 млн. т (1994). Буйнейшыя вытворцы — Расія, Кітай і Польшча (удз. в. кожнай краіны складае больш за 10% сусв. валавога збору).

Аснову с.-г. вытв-сці Беларусі складае збожжавая гаспадарка. Збожжавыя культуры займаюць амаль палову ўсёй яе пасяўной плошчы (у 1996 — 43,2%) і выкарыстоўваюцца на харч. і фураж-

**Валавы збор асноўных сельскагаспадарчых культур на Беларусі (тыс. т) у гаспадарках усіх катэгорый**

| | 1980 | 1990 | 1996 |
|---|---|---|---|
| Збожжавыя і зернебабовыя | 4108 | 7035 | 5786 |
| Ільноваланко | 61 | 52 | 49 |
| Цукровыя буракі | 1122 | 1479 | 1011 |
| Бульба | 9333 | 8590 | 10 881 |
| Агародніна | 733 | 749 | 1204 |
| Плады і ягады | 414 | 373 | 439 |